евро за три дня. Цены – низкие и привлекают множество горожан и туристов. С помощью «Ярмарки наций» практикуется сохранение народных ремёсел, кулинарии и корневых жанров искусства Литвы, а Вильнюс остаётся одним из городов мира, поток иностранных туристов в который постоянно возрастает. Очевидно, что с этого фестиваля не стыдно брать пример организатором форумов этнокультуры в соседних странах.

Согласимся, что идея и воплощение «Ярмарки наций» – замечательные, поэтому проект имеет поддержку в обществе. Ассоциация греческих общественных организаций Литвы создана в 1991 г. В организацию входят 124 семей, её президентом (с года основания) – являюсь я (совмещая эту должность с обязанностями председателя комиссии национальных общин и религий г. Вильнюса, созданной Городским советом и должностью председателя Греческой общины Вильнюса «Pontos»). Основные направления деятельности «Ассоциации»: сохранение греческой культуры и традиций, образования, защита интересов греков, создание воскресной греческой школы, участие во всех институциях Литвы, где затрагиваются греческие интересы.

Ежегодно мы осуществляем мероприятия в рамках двух крупных проектов: «Европейский союз и культурное наследие Византии» (с 2003 г.), начатый в канун 550-летия падения Константинополя, и «Северные Афины: диалог культур между Востоком и Западом» (с 2004 г.). К деятельности в рамках проектов мы привлекаем членов общественных организаций, членов Сейма, городского совета Вильнюса, учёных из 12 стран. Также в этих проектах приняли участие фольклорные коллективы из 8 стран: Греции, Болгарии, Латвии, Беларуси, Украины, Сербии, Грузии, Молдовы. Греческая община «Pontos» всегда активно включалась в общегородской ритм осенних праздников, предлагая свой вклад в «общий котёл». Кроме участия в муниципальных концертах и форумах, мы обычно проводим (в рамках «Tautų mugė») Международную научную конференцию «Bizantijos tautų sandrauga ir jos reikšmė Europos civilizacijai», посвящённую культурному наследию Православия и Византии в Центрально-, Восточноевропейском и Циркумбалтийском регионах. В конференции участвуют учёные Греции, России, Литвы, Украины, Беларуси, всем им есть что обсудить и чем поделиться. Греческая община Литвы «Pontos» носит имя одного из древнейших эллинистических государств мира – древнего Понта, в чью историю вписаны имена династии Селевкидов – потомков соратника и телохранителя Александра Македонского Селевка и Митридата VI Евпатора – одного из последних правителей, успешно противостоявших агрессии Рима. Мы помним традиции своего народа и уважаем традиции и культуры других народов.

Мне кажется, что сотрудничество Литвы и Беларуси в области этнокультуры надо развивать и обязательно рассмотреть проект проведения «Ярмарки наций» в Минске. С помощью уже опробованной формы осеннего праздника культур можно чрезвычайно многого достичь в деле сохранения народных ремёсел, этнической кулинарии, корневых жанров искусства народов Беларуси. Как я знаю, на территории страны проживают представители около 100 этносов и национальностей (в Литве – около 200), а Минск станет одним из городов мира, поток иностранных туристов в который будет постоянно расти.

***Таццяна Мармыш***

## ДА ПЫТАННЯ ЗМЕСТУ КАНЦЭПТА «ТРАДЫЦЫЯ» Ў СУЧАСНАЙ ГУМАНІТАРЫСТЫЦЫ

*Артыкул прысвечаны аналізу двух асноўных падыходаў да інтэрпрэтацыі канцэпта «традыцыя» ў сучаснай гуманітарыстыцы, змест якіх выяўляецца супрацьлеглым.*

***Tatsiana Marmysh***

## ON THE CONTENT OF «TRADITION» CONCEPT IN MODERN HUMANITIES

*This article is devoted to the analysis of two main approaches towards the interpretation of the «tradition» concept in modern humanities research. Their matters are revealed opposit.*

Традыцыя як канцэптуальна-тэарэтычная праблема працяглы час знаходзіцца пад увагай даследчыкаў. Згодна з натуралістычнай парадыгмай, якая панавала ў разуменні традыцыі пачынаючы з аднаго з яе першых тэарэтыкаў Э. Бёрка і фактычна да 80-х гг. XX ст., яна звязваецца з натуральнымі аб’ектамі, пэўнай прасторай, часавай працягласцю, а адпаведныя традыцыйныя супольнасці характарызуюцца абмежаванасцю і дыскрэтнасцю [8, с. 286].

З пазіцыі супрацьлеглага падыходу традыцыя – інтэрпрэтатыўна-сімвалічны працэс, ідэйнае ядро якога можа змяняцца ў часе [8, с. 273]. У пэўным сэнсе адбываецца, па вызначэнні Э. Хобсбаўма, «вынаходніцтва традыцыі», а менавіта ўсталяванне практык, звычайна рэгуляваных адкрыта або негалосна прынятымі правіламі рытуальна-сімвалічнага кшталту, што імкнуцца замацаваць пэўныя паводзінныя каштоўнасці і нормы і аўтаматычна пераймюцца з мінулага [9, с. 1]. Такім чынам, традыцыя канструюецца адносна пэўных уяўленняў аб яе сутнасці «тут-і-цяпер». Уяўленні могуць быць даволі лакальнымі, а таксама мэтанакіравана імкнуцца да шырокага распаўсюджвання, як, напрыклад, дзяржаўная ідэалогія, што ў ідэале мусіць мець уласную міфалогію, традыцыю і, адпаведна, пераемнасць: агульнасць гісторыі членаў супольнасці ў якасці фактару нацыянальна-дзяржаўнай ідэнтычнасці актуалізуе асэнсаванне гісторыі не толькі як пэўнай паслядоўнасці падзей у часе, але і свядомую суб’ектыўную іх рэканструкцыю ў калектыўнай памяці.

Канструктывісцкі падыход да фарміравання традыцыі, тым не менш, не адмаўляе неабходнасць некаторых культурна тоесных грамадству (калі традыцыя шырокая) ці супольнасці (калі традыцыя лакальная) элементаў [3, с. 102]. «Ядзерная зона» традыцыі неабходная для пераходу традыцый з камунікатыўнай кароткатэрміновай у культурную памяць. Аднак, ва ўмовах татальнага адмаўлення культурнай парадыгмы логацэнтрызму, змяняецца статус ядра, больш за тое, падвяргаецца крытыцы яго наяўнасць як такога.

Калі размова ідзе аб элементах, тоесных культуры, звычайна адбываецца апеляцыя да праблемы аўтэнтычнасці, дзе канцэпт «аўтэнтычнасць» прымяняецца ў кантэксце дыскусій аб індыгенных (карэнных) народах [3, с. 93]. Пад «аўтэнтычнасцю» разумеецца перадусім этнакультурная аўтэнтычнасць, заснаваная на супастаўленні феномена ці нейкай яго якасці з умоўнай першакрыніцай, якая акумулюе этнічныя асаблівасці культуры, для таго, каб адназначна ўказаць на іх тоеснасць і тым самым абазначыць аўтэнтычнасць сучаснага феномена – адпаведнасць гэтай жа праяве культуры ў яе тэмпаральнай разгортцы «раней». Такая інтэрпрэтацыя ўсё часцей падвяргаецца крытыцы (напр., Л. Шайнэр [10, с. 228, 229]), сканцэнтраванай на трох асноўных складніках «ідэалогіі аўтэнтычнасці» ў еўраамерыканскай думцы: 1) на поглядзе на прыроду аўтэнтычнасці як на традыцыю, звязаным з ідэяй аўтаноміі, самадастаковасці, нязменнасці традыцыйных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

грамадстваў, роўных гегелеўскім «негістарычным народам»; 2) на міфе аб несапсаваных «дакантактных» культурах з выключным правам прадукаваць аўтэнтычныя артэфакты і іх носьбітах-аўтахтонах, якія практычна жывуць у іншым часавым вымярэнні; 3) на ідэі непазбежнага беззваротнага парушэння адзінай стылістычнай традыцыі мастацтва і іншых нематэрыяльных практык праз пранікненне ідэй з-за яе вонкавых межаў.

Акрамя таго, аўтэнтычнае ў сэнсе асаблівага і саматоеснага супрацьпастаўляецца ідэнтычнаму як універсальнай якасці, паколькі ідэнтычнасць рэпрэзентуе валоданне ўласцівасцямі пэўнага класа ці сацыяльнай групы [3, с. 100], тым самым імкнецца да не-ўнікальнасці. У разрэзе дадзенага падыходу аўтэнтычнасць знаходзіцца ў аснове антрапалагічных тэорый і ўкарэнена ў самасвядомасці этнаідэалогій сацыяльных груп [7, с. 4].

Іншы падыход да катэгорыі «аўтэнтычнасць» грунтуецца не на самаідэнтычнасці аб’екта, а на яго тоеснасці асяроддзю існавання, кантэксту, які змяняецца і змяняе аб’ект, што вымяраецца па крытэрыі аўтэнтычнасці, праз сістэмную ўзаемазалежнасць. Гэты від тоеснасці баззіруецца на культурна-антрапалагічнай партыцыпацыі аб’екта і элементаў прасторы яго існавання прыродна-фізічнага і культурна-сімвалічнага парадкаў.

Традыцыя можа знаходзіць сябе не толькі ў этнічных кампанентах культуры. З цягам часу яна набыла даволі шырокія канатацыі, звязаныя з культурай у шырокім сэнсе, нацыянальнай культурай, якая ўключае, акрамя ўласна этнічнага кампаненту, дыферэнцыраваныя паводле розных класіфікацый элементы традыцый, напрыклад, субкультур. З такой прычыны традыцыю, што функцыянуе як культурна-гістрычная памяць супольнасці, выражаную праз сімвалічныя каштоўнасці-сведчанні пра прывязанасць да этнакультурнага «карэння», моцных сямейных сувязей і фарміруючую ідэнтычнасць, называюць «традыцыяй даўняй». «Новая традыцыя» паўстае для задавальнення экзістэнцыйных патрэб і мае функцыю павышэння ўзроўню (стандартаў) жыцця, уплывае на структурныя змены іерархіі каштоўнасцей [6, с. 136].

Актуальнасць у гэтым сэнсе набывае адзін з галоўных парадоксаў ідэалогіі традыцыі, выражаны ў спробе захавання «непазбежных зменаў», рэканструкцыі ці вынаходніцтва традыцый, якія захаванне мусіць зафіксаваць у пэўным іх стане [8, с. 288]. Непазбежна ўзнікае рытарычнае пытанне: ці з’яўляецца імкненне зафіксаваць карэктным спосабам працягнуць жыццё традыцыі з унутраным дынамічным патэнцыялам?

Сацыёлаг Э. Гідэнс адносна спробы фармалізацыі традыцыі бачыць антаганізм паміж канцэптамі «традыцыя» і «спадчына»: «Традыцыя, пазбаўленая зместу і падвергнутая камерцыялізацыі, пераўтвараецца або ў частку гістарычнай спадчыны, або ў кіч» [2, с. 60–61]. Аўтар, пашыраючы сэнсавае поле традыцыі ад элемента этнікі да традыцыі навуковай, прапануе пастулат аб тым, традыцыі будуць існаваць заўсёды, паколькі яны «надаюць жыццю пераемнасць і форму» [2, с. 61]. Блізкая пазіцыя ў А. А. Пеліпенкі. Аўтар выдзяляе актуальную культуру і культурную спадчыну, адносячы да апошняй усё тое, што існуе латэнтна, выключана з працэса самаразвіцця і культурагенеза, знаходзіцца на перыферыі культурнай сістэмы як «залішне разнастайныя феномены», якія, аднак, актуалізуюцца, калі культурная сістэма змяняецца [5, с. 391, 392]. Відавочна прынцыповае разыходжанне названых падыходаў з інтэрпрэтацыяй ЮНЕСКА нематэрыяльнай культурнай спадчыны як «жывых» элементаў культуры (living heritage).

Таксама ў тэарэтычным асэнсаванні традыцыі сёння акцэнт змяшчаецца на некаторыя прынцыповыя, але ўсё яшчэ дыскусійныя пытанні, важныя для яе разумення. Першае засноўваецца на размыванні крытэрыяў традыцыйнасці, у тым ліку, калі, напрыклад, «...вераванні і практыкі, якія ўяўляюцца анамальнымі ў кантэксце агульнай мадэлі развіцця сучасных «вэстэрнізаваных» грамадстваў, маўкліва прызнаюцца праявамі «традыцый»  [4, с. 271]. Другое сканцэнтравана на разглядзе традыцыі ў знітаванні з фальклорам і вясковай культурай, у асноўным, дамадэрнага тыпу, выключаючы гарадскую культуру і, у гэтай сувязі, указваецца на недастатковасць крытэрыя вуснасці як атрыбутыўнага пры ідэнтыфікацыі тэкста як фальклорнага пры з’яўленні прынцыпова пісьмовых форм народнай культуры – дзённікаў, графіці, прыватных абвестак [1, с. 110]. Таму адной з важных задач тэарэтычнага характару выступае неабходнасць удакладнення судачыненняў і сэнсавага напаўнення канцэптаў «традыцыя», «аўтэнтычнасць», «фальклор», «нематэрыяльная спадчына», «нематэрыяльная культура».

**Спіс літаратуры:**


1. Бартминьский, Е. Фольклористика, этнонаука, этнолингвистика – ситуация в Польше / Е. Бартминьский // Первый Всероссийский конгресс фольклористов : сб. докл. Первого Всероссийского конгресса фольклористов, Москва, 1–6 февраля 2006 г. / Гос. респ. центр русского фольклора ; отв. ред. А. С. Каргин. – М., 2006. – Т. II. – С. 106–117.
2. Гидденс, Э. Ускользающий мир / Э. Гидденс. – М. : Весь мир, 2004. – 116 с.
3. Давыдов, В. Н. Культурная аутентичность и коренные народы: институциональные процессы и политика идентичности / В. Н. Давыдов // Журнал социологии и социальной антропологии. – 2006. – Т. 9., № 3. – С. 93–109.
4. Келли, К. Опасности, которые таит знакомый мир: русская народная культура от начала XIX века / К. Келли // Антропологический форум. – 2005. – № 3. – С. 270–279.
5. Пелипенко, А. А. Проблемы изучения культурного наследия в условиях глобализации / А. А. Пилипенко // Первый Всероссийский конгресс фольклористов : сб. докл. Первого Всероссийского конгресса фольклористов, Москва, 1–6 февраля 2006 г. / Гос. респ. центр русского фольклора ; отв. ред. А. С. Каргин. – М., 2006. – Т. II. – С. 382–404.
6. Bukowska-Floreńska, I. Tradycje lokalne i rodzinne a tożsamość kulturowa współczesnych środowisk podmiejskich i miejskich. Przykład Górnego Śląska / I. Bukowska-Floreńska // Ich male ojczyzny: Lokalność, korzenie i tozsamość w warunkach przemian ; red. M. Trojan. – Wroclaw, 2003. – S. 135–153.
7. Handler, R. Authenticity / R. Handler // Anthropology Today. – 1986. – № 2. – P. 2–4.
8. Handler, R. Tradition, Genuine or Spurious / R. Handler, J. Linnekin // The Journal of American Folklore. – 1984. – Vol. 97, № 385. – P. 273–290.
9. Hobsbawm, E. Introduction: Inventing Traditions / E. Hobsbawm // The Invention of Tradition ; ad. by E. Hobsbawm, T. Ranger. – Cambridge, 1983. – P. 1–14.
10. Shiner, L. «Primitive Fakes», «Tourist Art», and the Ideology of Authenticity / L. Shiner // The Journal of Aesthetics and Art Criticism. –1994. – Vol. 52, № 2. Spring. – P. 225–234.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ